Настаўніцкая газета
21 студзеня 2020 года

# Абнавіліся школы

**У Гродзенскай вобласці не толькі будуюць новыя дзіцячыя садкі і школы, вядзецца і вялікая работа па рамонце ўстаноў адукацыі. Першы дзень трэцяй чвэрці навучэнцы сярэдняй школы № 2 Шчучына пачалі ў абноўленай школе.**

Рамонтныя работы тут пачаліся ў чэрвені мінулага года. За невялікі час уцяплілі фасад будынка, зрабілі новы дах, адрамантавалі і мадэрнізавалі ўсе вучэбныя класы, калідоры, вестыбюлі, спартыўную і актавую залы, адміністрацыйныя, тэхнічныя і дапаможныя памяшканні, замянілі асвятленне, дзвярныя і аконныя блокі, канструкцыі падлог, сістэму ацяплення. У харчаблоку заменена тэхналагічнае і інжынернае абсталяванне. Плануецца таксама абсталяванне чатырох кабінетаў: фізікі, хіміі, біялогіі і інфарматыкі.

Некалькімі днямі раней урачыстасці пасля заканчэння рамонту адбыліся і ў Воранаўскай сярэдняй школе. Першы комплекс яе будынкаў быў узведзены ў 1956 годзе. Рэканструкцыя праходзіла ў некалькі этапаў. У выніку для вучняў пачатковай школы з'явіліся спальныя і гульнявыя пакоі на 80 месцаў. Тут будуць займацца і групы прадоўжанага дня. У школе замест звычайнай бібліятэкі абсталяваны інфармацыйна-бібліятэчны цэнтр з вялікай чытальнай залай, устаноўлена сучасная сістэма лічбавага відэаназірання. Абноўленая сталовая ўмяшчае 330 чалавек. Адрамантаваны спартыўная і актавая залы, заменены вокны.

Такія работы выкананы дзякуючы праекту "Мадэрнізацыя сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь", які фінансуецца Міжнародным банкам рэканструкцыі і развіцця.

На ўрачыстасцях у абноўленых школах пабывалі намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар Пранюк і начальнік галоўнага ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама Руслан Абрамчык.

А 15 студзеня ў Шчучыне адбылася яшчэ адна падзея — завяршылася мадэрнізацыя дзіцячай школы мастацтваў. Рамонтныя работы тут выкананы дзякуючы ўдзелу ў міжнародным праекце "Сацыяльная інтэграцыя ўразлівых дзяцей пры дапамозе мастацтва па абодва бакі літоўска-беларускай граніцы".